## КАНДЫДАТЫ Ў ГАРАДСКІ САВЕТ НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ

По Студэнцкай выбарчай акрузе № 2
ШПАК Васіль Якаўлевіч, майстар завода "Чырвоны барацьбіт".

По Паштовай выбарчай акрузе № 3
ГАРДЗЕЙНАК Галіна Трафімаўна, галоўны бібліятэкар Цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя А.С.Пушкіна.

По Мінскай выбарчай акрузе № 4
ХРАПКІН Аляксандр Анатольевіч, майстар нарыхтоўчага цэха завода "Чырвоны барацьбіт".

По Шаўчэнкаўскай выбарчай акрузе № 8
ЭЙНЫШ Вольга Будакімаўна, загадчыца аддзялення рацыянальнага дома.

По Астроўскай выбарчай акрузе № 4
КАЗЛОЎ Мікалай Макаравіч, дырэктар дзіцячай музычнай школы № 1

По Кіраўскай выбарчай акрузе № 35
СЯРОГІН Сяргей Віктаравіч, сьлесар завода "Чырвоны барацьбіт".

По Дняпроўскай выбарчай акрузе № 42
МАКАВЕЦКІ Іван Ілліч, намесьнік дырэктара па навучальнай рабоце механіка-тэхналагічнага тэхнікума.

По Рабочай выбарчай акрузе № 52
МАКАРАНКАЎ Андрэй Хведаравіч, электраманцёр завода "Легмаш".

По Трэцяй бібліятэчнай выбарчай акрузе № 56
ШАТКОЎ Валеры Канстанцінавіч, сакратар парткама Ільнокамбіната

По Фабрычнай выбарчай акрузе № 63
КУДРАЧКОВА Вера Юльянаўна, дырэктар СПТВ № 45

По Молакаўскай выбарчай акрузе № 69
КУДРАЎЦАЎ Канстанцін Генадзевіч, выкладчык тэхнікума чыгуначнага транспарту.

По Другой Сарокінскай выбарчай акрузе № 91
МАКСІМЕНКА Ягор Цімафеевіч, фрэзероўшчык завода "Чырвоны Кастрычнік".

Не будзьце абыякавымі, праявіце палітычную сьвядомасьць!

Усе на выбары!

Газета выдрукавана з ласкі Божай у слаўным месьце Оршы ў друкарні Сьпірыдона Собаля. "КУЦЕЙНА". Выданьне Аршанскай Рады БНФ "Адраджэньне".

Адрас для карэспандэнцыі: 211030, Орша, вул.Дэпоўская,д.7, Санько Юрась Хведаравіч. Тэлефоны для сувязі з рэдакцыяй "Куцейны" і Аршанскай Радай БНФ : Санько Юрась -- 9-25-41; Кажамяка Алесь -- 2-33-97; Мельнікаў Андрэй -- 2-00-74.
Без Вашых ахвяраваньняў выданьне "Куцейны" стане немагчымае. Ахвяраваньні можна перадаваць непасрэдна ў Раду БНФ, так і перасылаць грашовымі пераводамі на адрас: 211030, Орша, вул.Фёдарава,д.7, кв.16, Сярожкіну Аляксандру Міхайлавічу.

Fond 1/11 sprava K95

# КУЦЕЙНА

№ 1 1989 г.

ВЫДАНЬНЕ АРШАНСКАЙ РАДЫ БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ»

Адхінем заслону часу і спазнаем сябе такімі, якімі мы былі. Пачнем зьбіраць аськепкі нашай вялікай гісторыі і адчуем сябе народам, які быў, ёсьць і будзе вечна жыць на гэтай зямлі.

## 475 ГАДОЎ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ ПАД ОРШАЙ



Бітва з Масквой пад Оршай, 1514 г.

Дрэварыт з "Хронікі Польскай" М.Бельскага. 1597г.

Улетку 1514 года маскоўскія войскі учынілі аблогу пагранічнай цытадэлі Беларускай дзяржавы /якая тады называлася Вялікім княствам Літоўскім/ – места Смаленска. У выніку здрады князя Міхала Глінскага, які перайшоў на бок Масквы, Смаленск пасьля колькіх баёў быў захоплены. Ад ягоных муроў маскоўскія палкі пачалі прасоўвацца ўглыб Беларусі, палячы паселішчы, беручы палонных, і хутка наблізіліся да Оршы.

